**В.Ф. Шалькевіч**

# ПАЧАТАК ВЫШЭЙШАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ І ЛІТВЕ

У XIV—XV стагоддзях вышэйшую юрыдычную адукацыю выхадцы з Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) атрымлівалі выключна ў заходнееўрапейскіх універсітэтах — Польшчы, Германіі, Італіі, Францыі. Аднак з XVI стагоддзя ў сувязі з развіццём і інтэнсіфікацыяй грамадска-палітычнага жыцця, рэформай мясцовага судаўладкавання значна пашырылася сфера прававога рэгулявання грамадскіх адносін, што і паставіла на павестку дня задачу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных правазнаўцаў непасрэдна на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

Першай спецыяльнай юрыдычнай установай на землях ВКЛ было ***вучылішча цывільнага права***, створанае магістратам горада Вільні ў 1566 годзе пры касцёле святога Яна. У вучылішчы выкладаліся рымскае, саксонскае, магдэбургскае, беларускае (і, магчыма, кананічнае) права. Рымскае права разглядалася як тэарэтычная аснова юрыдычнай адукацыі, неабходная для арыентацыі ў тагачасным заканадаўстве, выкладанне ж саксонскага, магдэбургскага і беларускага права мела прыкладны характар. Святаянскае віленскае юрыдычнае вучылішча, якое праіснавала больш за 10 гадоў, паклала пачатак мясцовай традыцыі юрыдычнай адукацыі і адыграла значную ролю ў грамадскім і дзяржаўным жыцці ВКЛ XVI стагоддзя. Гэта адзначыў у свой час адзін з самых вядомых даследчыкаў гісторыі ВКЛ  І.І. Лапа (1869—1944). У адной з сваіх навуковых прац ён пісаў: «Святаянскае віленскае юрыдычнае вучылішча несумненна рыхтавала знатакоў, дзейнічаўшых у княстве законаў і юрыдычных парадкаў; менавіта выпускнікі вучылішча рабіліся потым юрыстамі-практыкамі ў якасці інстыгатараў (судовых абвінаваўцаў — В.Ш.) і пракурораў»[1].

На чале Святаянскага віленскага юрыдычнага вучылішча стаяў доктар права Петр Ройзій. Ен выкладаў тут рымскае, саксонскае і магдэбургскае права. Курс беларускага права чытаў Грахоўскі. Святаянскае віленскае юрыдычнае вучылішча было сярэдняй спецыяльнай навучальнай установай.

Менавіта таму ў гэты ж час, у сярэдзіне XVI стагоддзя, была выказана думка аб стварэнні на тэрыторыі ВКЛ вышэйшай навучальнай установы. Яна належала канцлеру ВКЛ Мікалаю Радзівілу Чорнаму (1515—1565), лідэру

мясцовага рэфармацыйнага руху, прыхільніку кальвінізма. Яго падтрымлівалі падканцлер ВКЛ А. Валовіч, літоўскі крайчы Я. Кішка і іншыя прыхільнікі Рэфармацыі[2]. Да гэтага іх падахвочвала адкрыццё ў 1544 годзе пратэстанцкага універсітэта ў Кенігсбергу (Крулеўцу), куды стала выязджаць беларуска-літоўская моладзь для атрымання вышэйшай (у тым ліку і юрыдычнай) адукацыі. Аднак заўчасная смерць Мікалая Радзівіла Чорнага перашкодзіла рэалізацыі намечаных планаў.

У сувязі з гэтым першая вышэйшая навучальная ўстанова на беларускіх і літоўскіх землях была заснавана толькі ў перыяд Контррэфармацыі і была звязана з дзейнасцю ордэна езуітаў. У 1579 годзе езуітамі пры падтрымцы караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя была адчынена ў Вільні ***Віленская езуіцкая акадэмія*** — каталіцкі ўніверсітэт, які ва ўсіх прывілеях ураўноўваўся з Кракаўскім універсітэтам. У складзе акадэміі было два факультэты: ***філасофскі*** і ***тэалагічны***. На першым выкладаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу: фізіка, метафізіка, матэматыка, логіка, рыторыка, паэтыка, геаграфія, старажытныя (грэчаская, лацінская, яўрэйская) і новыя (нямецкая, французкая) мовы; на другім — свяшчэннае пісанне, тэалогія (палемічная, маральная, схаластычная), кананічнае права, казуістыка[3]. Як бачым, на тэалагічным факультэце адразу пачало выкладацца кананічнае права.

Аднак ***юрыдычны*** факультэт быў створаны і пачаў дзейнічаць у складзе Віленскай езуіцкай Акадэміі толькі ў 1644 годзе[4]. Яго заснавальнікам быў сын славутага Льва Сапегі — Казімір Леў Сапега (1609-1656), падканцлер Вялікага княства Літоўскага. Ён ахвяраваў на ўтрыманне прафесараў юрыдычнага факультэта 12 500 польскіх злотых, а таксама абяцаў дадаць да гэтай сумы яшчэ 25 000 польскіх злотых і вызначаць з сваіх сродкаў кватэрныя грошы для прафесараў не з духавенства[5].

Казімір Леў Сапега перадаў таксама Акадэміі бібліятэку свайго бацькі, якую апошні збіраў на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў. Гэты кнігазбор, вядомы пад назвай ***«Bibliotecа Sapiehana»***, налічваў каля 3000 назваў кніг[6].

Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Уладзіслаў IV Ваза (1632—1648) ў сваім прывілеі пацвердзіў усе правы, дадзеныя раней Акадэміі, а таксама пажадаў, каб у ёй «публічна выкладаліся курсы кананічнага і цывільнага права і каб тым, хто праявіць сябе належным чынам падрыхтаваным по гэтых навуках, прысуджаліся ўсе навуковыя ступені, якія прысуджаюцца ў другіх акадэміях і універсітэтах»[7].

Па запрашэнню Казіміра Льва Сапегі ў Вільню прыбылі чатыры прафесары-правазнаўцы: два немцы – прафесар цывільнага права С. Дзільгер (Dilger), прафесар кананічнага права І. Шаўэр (Schauer) (яны прыбылі ў Вільню з каталіцкага універсітэта горада Інгольштата, што ў Баварыі), а таксама адзін іспанец, прафесар цывільнага права Б. Соксо (Soxo) з каталіцкага універсітэта горада Гранады і адзін беларус, ураджэнец Віцебшчыны, прафесар кананічнага права А. Алізароўскі (1610–1659), якога запрашэнне на працу ў Вільню застала ў Падуанскім універсітэце. У хуткім часе прыбыў шэраг іншых прафесараў. Дэканам юрыдычнага факультэта стаў прафесар С. Дзільгер[8].

Найбольш значнай фігурай сярод выкладчыкаў юрыдычнага факультэта таго часу быў А. Алізароўскі. Амаль усё яго свядомае жыццё цесна звязана з беларускай зямлёй. Сярэднюю адукацыю ён атрымаў у езуіцкіх калегіумах Нясвіжа, Вільні і Полацка, потым удасканальваў веды ў вышэйшых навучальных установах Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Італіі. У 1644 годзе ў Інгольштаце ў мясцовым універсітэце ён атрымаў ступень доктара абоіх праў. Між іншым, годам раней тут была надрукавана яго дысертацыя пад назвай «Палітычныя пытанні» (1643). Паколькі ўладкавацца на працу ў Інгольштаце яму не ўдалося А. Алізароўскі паехаў у Італію. Тут яго і застала запрашэнне Л.К. Сапегі на працу ў Вільню ў мясцовы універсітэт. На радзіме А. Алізароўскі ўзначальваў спачатку кафедру кананічнага, а потым цывільнага права. Выкладчыцкая дзейнасць А. Алізароўскага ў Вільні працягвалася да 1655 года. На радзіме ім была створана галоўная праца жыцця «Аб палітычнай супольнасці людзей» («De politica hominum societate»). Яна была надрукавана ў 1651 годзе ў Гданьску на лацінскай мове. Твор напісаны на падставе глыбокіх ведаў як старажытнай, так і сучаснай А. Алізароўскаму палітыка-прававой літаратуры. У ім працытаваны працы больш як 250 прадстаўнікоў палітычнай думкі. Найбольш часта аўтар спасылаўся на Арыстоцеля і Ж. Бадэна.

Кніга складаецца з уводзін і трох частак — «Гаспадарка», «Грамадства», «Дзяржава».

У першай частцы разглядаюцца праблемы шлюбу, сям'і, а таксама адносіны паміж панамі і прыгоннымі. Аналізуючы сямейна-шлюбныя адносіны, А. Алізароўскі закранае пытанні выхавання. Ён выказвае ідэю неабходнасці навучання шляхецкай моладзі рамёствам. Каб пераканаць шляхту ў неабходнасці авалодання грамадзянскімі прафесіямі, А. Алізароўскі спасылаецца на кнігу выдатнага англійскага гуманіста XVI ст. Т. Мора «Утопія».

(У дзяржаве ўтапійцаў кожная сям'я, як вядома, спецыялізавалася ў адным відзе якога-небудзь рамяства). А. Алізароўскі таксама паказвае выгады, якімі карыстаюцца асобныя еўрапейскія краіны ад росквіту рамёстваў (у прыватнасці, Англія). У гэтай частцы А. Алізароўскі разглядае таксама становішча сялян у Рэчы Паспалітай, крытыкуе прыгонніцтва, як з'яву, супярэчную натуральнаму праву і шкодную грамадству. Запрыгоньванне сялян А. Алізароўскі разглядае як гвалт шляхты над сялянамі. Ён выказваецца за такія адносіны паміж панамі і прыгоннымі, пры якіх селянін за атрыманую ад пана зямлю плаціў бы апошняму толькі грашовы падатак (чынш) і меў бы права мяняць месца жыхарства ў адпаведнасці з сваімі жаданнямі.

У другой частцы А. Алізароўскі палемізуе з аўтарамі, якія сцвярджалі, што толькі прадстаўнікі шляхты павінны карыстацца грамадзянскімі правамі. Шляхта, як вядома, за выкананне абавязку воінскай службы надзялялася каралём Рэчы Паспалітай правам спадчыннага валодання зямлей, дзякуючы чаму карысталася перш за ўсе палітычнымі правамі. А.Алізароўскі даказвае неабходнасць пашырэння грамадзянскіх праў на ўсіх свабодных жыхароў дзяржавы, у тым ліку і сялян. Пад уплывам гуманістычнай ідэалогіі А.Алізароўскі звязвае паняцце шляхецтва з маральнай дасканаласцю, духоўнай высакароднасцю. Ён праводзіць думку, што сапраўднае шляхецтва складаецца з маральнасці, адукаванасці, ведаў, рацыянальнага ажыццяўлення сваіх правоў і свабод, а таксама сумленнага выканання сваіх грамадзянскіх абавязкаў. Гэта азначала, што, нягледзячы на існаванне ў грамадстве розных саслоўяў (вышэйшых і ніжэйшых), для кожнага іх прадстаўніка павінна была адкрывацца магчымасць пераходу з аднаго саслоўя ў другое, а таксама грамадзяне ўсіх саслоўяў павінны былі быць роўнымі перад законам.

У трэцяй частцы аналізаваліся паходжанне і сутнасць дзяржавы, формы дзяржаўнага кіравання. Дзяржаву А. Алізароўскі вызначае як «створанае з паселішчаў аб'яднанне людзей, якія звязаны правам і згодай у імя добрага і шчаслівага жыцця». Разглядаючы розныя формы дзяржаўнага ўладкавання (манархія, тыранія, арыстакратыя, дэмакратыя), іх станоўчыя і адмоўныя бакі, А. Алізароўскі прыходзіць да высновы, што дасканаласць і моц дзяржавы залежаць ад найбольш рацыянальна выбранай формы дзяржаўнага кіравання. Сам А. Алізароўскі быў прыхільнікам спадчыннай манархіі. Ён таксама праводзіў думку аб тым, што манарх не павінен быць іншаземцам.

А. Алізароўскі даў таксама класіфікацыю права. Ён выдзяляў: боскае права, натуральнае права і права народаў.

Такім чынам, адкрыццё і дзейнасць юрыдычнага факультэта ў Віленскай езуіцкай акадэміі садзейнічала эфектыўнаму прававому рэгуляванню грамадскіх адносін у ВКЛ, стымулявала развіццё палітыка-прававой думкі.

---

[1] Лаппо И.И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя. СПб., 1901. С. 500

[2] История Вильнюсского университета. Вильнюс, 1979. С. 12

[3] Шалькевіч В.Ф. Віленскі універсітэт //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск, 1994. Т.2. С. 287–288

[4] Бартусявичюс А.А., Мишкинис П.Н. Развитие политико-правовой мысли в Вильнюсском университете (1579-1979 гг.) //Советское государство и право. 1980. №1. С.110

[5] Пічэта У.І. Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. Мінск, 1991. С.11.

[6] Там жа.

[7] Цыт. па: Piechnik L. Dzieje Akademii Wileńskiej. Rzym, 1983. T.2. S. 163

[8] Ibidem. S.171.